# « І СЁЛАЎ ІМЁНЫ – ЯК ГУКІ ЦЫМБАЛАЎ…» (ТАПАНІМІКА КАРЭЛІЦКАГА РАЁНА)

**А. С. Асташка**
*ДУА «Сярэдняя школа г.п.Мір імя Г.І.Сташэўскай»*
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць,*
*Рэспубліка Беларусь, mir-school@edu-korelichi.by*

Любая геаграфічная назва ўтойвае ў сабе пэўны сэнс. Беззмястоўных, бессэнсоўных найменняў не існуе. Паходжанне тапонімаў сваёй мясцовасці павінна цікавіць кожнага чалавека. Актуальнасць работы абумоўлена неабходнасцю вывучэння культурнай і гістарычнай спадчыны родных мясцін, захавання народных традыцый, развіцця сучаснай вёскі, вызавання патрыятызму. Мэта работы – пашырыць цікавасць да гісторыі і культуры свайго краю, сабраць даступныя звесткі пра мінуўшчыну Карэліччыны, зацікавіць тых, хто мае інтарэс да краязнаўства. Работа павінна паспрыяць фарміраванню ўстойлівай цікавасці да нацыянальнай культуры і ўсведамленню яе самабытнасці. У гэтым практычная значымасць даследавання. Вынікам стала групоўка айконімаў Карэліцкага раёна, якая дае іх сціслыя гісторыка-геаграфічныя характарыстыкі.

*Ключавыя словы:* патрыятызм; краязнаўства; малая Радзіма; тапаніміка; тапонім; айконім.

Тапаніміка – навука, якая вывучае геаграфічныя назвы (тапонімы), заканамернасці іх узнікнення, развіцця, функцыянавання. Можна заўважыць, што кожная геаграфічная назва мае, па сутнасці, два значэнні. Па-першае, яна з’яўляецца імем таго ці іншага геаграфічнага аб’екта, па-другое, кожная назва ў нейкай ступені характарызуе гэты аб’ект [1, с. 5]. Вытокі тапаніміі Беларусі губляюцца ў глыбіні стагоддзяў, і цяжка цяпер адказаць, калі з'явіліся першыя геаграфічныя імёны на зямлі нашых продкаў. Геаграфічныя назвы з’яўляюцца ў біяграфіі чалавека ўжо ў першыя дні жыцця. Месца нараджэння – гэта першы адрас, з якім сустракаецца чалавек [4, с. 9]. Геаграфічныя назвы гарадоў і сёл, рэк і азёр вельмі разнастайныя па паходжанні. Адны з іх адлюстроўваюць асаблівасці прыродных умоў мясцовасці, іншыя характарызуюць склад насельніцтва і яго заняткі, трэція вызначаюць месцазнаходжанне геаграфічнага аб’екта [1, с. 8]. Каштоўнасць тапанімічных матэрыялаў тлумачыцца першым чынам устойлівасцю геаграфічных назваў, якія захоўваюцца нават у тых выпадках, калі з'явы, якія яго спарадзілі, змяніліся ці перасталі існаваць; геаграфічныя назвы ў гэтым выпадку становяцца своеасаблівымі гістарычнымі дакументамі. Фарміраванне тапонімаў ішло на працягу многіх вякоў. Нас зацікавіла паходжанне назваў населеных пунктаў нашай малой радзімы – Карэліцкага раёна.

Згодна са статыстыкай у Карэліцкім раёне 164 паселішчы (дадзеныя 2019), кожная з іх мае сваю гісторыю. На падставе аналізу розных пісьмовых дакументаў выяўлена, што на фарміраванне назваў паселішчаў раёна аказалі ўплыў прыродны, гістарычны, этнічныі лінгвістычны фактары. Зыходзячы з гэтага, нам удалося згрупаваць айконімы раёна і высветліць, што тапонімы большасці населеных пунктаў маюць славянскія карані [3, с. 21]. Вялікая група айконімаў Карэліцкага раёна пайшла ад асабовых імён заснавальнікаў і ўладальнікаў паселішчаў. Да іх адносяцца Карэлічы, Асташын, Жухавічы, Качаны, Райца, Раманы, Цырын, Юравічы, Сімакава, Некрашэвічы і многія іншыя. Элементы рэльефу часта служылі арыенцірам на мясцовасці. Гэта дало аснову назвам населеных пунктаў: Зарэчча, Забалоцце, Загор'е.

З месцазнаходжаннем і знешнім абліччамнаселеных пунктаў звязаны такія тапонімы, як Палужжа, Падгайна, Беражна, Лукі. З назвамі раслін і жывёл звязана вялікая група айконімаў: Альшаны, Зелянец, Дуброва, Беразавец, Мядзвядка, Варонча, Баранавічы. Наступная група тапонімаў звязана з гістарычнымі падзеямі і ўмовамі жыццянасельніцтва ў розныя часы: Баяры, Засценкі, Вялікая і Сіняўская Слабада, Аколіца. Фарміраванне беларускай народнасці ў XIV-XVI стст. Абумовіла вялікую колькасць назваў населеных пунктаў, звязаных з рознымі этнічнымі групамі насельніцтва: Ятвезь, Русацін, Вобрына. Група геаграфічных назваў сведчыць аб занятках насельніцтва ў мінулым. У залежнасці ад роду заняткаў узніклі наступныя назвы: Плужыны, Лядкі, Руднікі, Рудзьма, Сапатніца, Скробава.

Некаторыя назвы населеных пунктаў з'явілася пасля правядзення зямельнай рэформы ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст. Да групы айконімаў, абумоўленыях тыпамі паселішчаў можна аднесці Навасёлкі, Селішча, Новае Сяло.

Існуюць паселішчы з гідралагічнай асновай. Яны паходзяць ад назваў рэк або звязаны з выхадам падземных вод: Мір, Сэрвач, Уша, Міранка, Крынкі, Крынічнае. Асобную групу айконімаў утвараюць геаграфічныя назвы савецкага часу. З'явіліся населеныя пункты Краснае, Першамайскі. У апошнія гады знікаюць назвы ўрочышчаў, назаўсёды для беларускай гісторыі страчваецца вялізны пласт культуры. Даўно ўжо зніклі хутары, першакрыніцы назваў урочышчаў. Старыя людзі са сваімі сялібамі, садамі, вуліцамі і ладам жыцця адыходзяць. Разам з імі страчваюцца назвы і гісторыі ўзнікнення ўрочышчаў, што вядзе да збяднення нашай спадчыны. Напрыклад, у ваколіцах Міра зніклі урочышчы Яблонаўшчына, Звярынец, Машэчкі, Чорная Горка. Гэтыя назвы захаваліся толькі у памяці старажылаў, а маладое пакаленне пра іх слаба ведае. Надзвычай цяжка

высветліць, чаму так, а не інакш называецца геаграфічны аб'ект. У некаторых выпадках адказ на гэтае пытанне захоўваецца ў самой назве. Геаграфічныя назвы часта захоўваюць памяць аб падзеях, не запісаных у гістарычных летапісах. Адгадка іх таямніц можа даць новыя, вельмі цікавыя факты для гісторыка і географа. Але даследчыку тапонімаў неабходны глыбокія веды ў розных галінах навукі – гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, мовазнаўстве, археалогіі. Без гэтых ведаў можна часта памыліцца і не атрымаць патрэбных вынікаў даследавання. Усё гэта гаворыць аб тым, што збіраць мясцовыя геаграфічныя назвы няцяжка, а знайсці іх правільнае тлумачэнне і прасачыць іх паходжанне значна цяжэй. Пры тлумачэнні тапонімаў не варта рабіць заўчасныя вывады. Трэба грунтоўна і ўсебакова высветліць усе абставіны, пры якіх магла з'явіцца назва, добра ўявіць сабе тыя часы, у якія яна магла ўзнікнуць, ведаць мову таго часу. Памылкі пры тлумачэнні назваў здараюцца таму, што старадаўнюю назву людзі імкнуцца пазнаць з пункту гледжання сучаснай мовы і сучаснага спосабу жыцця. Пагэтаму да тлумачэння тапонімаў трэба перш за ўсё падыходзіць з пазіцыі не сучаснай мовы, а яе гісторыі. Вынікам праведзенага даследавання стаў пералік тапонімаў Карэліцкага раёна, які падае сціслыя гісторыка-геаграфічныя характарыстыкі назваў вёсак, урочышчаў і іншых геаграфічных аб'ектаў. Усе даследаваныя аб'екты маюць свой пэўны адрас у выглядзе геаграфічнага імя. Усяго даследавана больш 70 назваў аб'ектаў, высветлена навуковае і народнае тлумачэнне паходжання назваў, называюцца верагодныя версіі іх паходжання. Для больш змястоўнага раскрыцця этымалогіі назваў выкарыстаны легенды і паданні, звязаныя з аб'ектамі даследавання.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Жучкевіч В. А. Чаму так названа. Мінск : Народная асвета, 1969.
2. Жучкевіч В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. Мінск : Нар. асвета, 1974.
3. Карэліччына: людзі, падзеі, час : зб.навук.артыкулаў / Нац. акад. навук Беларусі. Мінск : Беларус. навука, 2012.
4. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Гродзен.вобл.; нармат. Даведнік / І. А. Гапанека, В. П. Лемцюгова і інш.; пад рэд. В. П. Лемцюговай. Мінск : Тэхналогія, 2004.
5. Рапановіч Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гродзенскай вобласці. Мінск : Навука і тэхніка, 1982.